kipedia.org/wiki/ Two_Singing_Boys_with_a_Lute_and_a_Music_Book. – Дата доступа: 01.11.2022.

*15.* Эдуард Мане. Флейтист, 1866 г., Музей Орсе, Париж [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Флейтист_(картина Мане). – Дата доступа: 01.11.2022.

УДК 791.229.2:398(476)

***А. Б. Грышчанка,***
*выкладчык кафедры народна-інструментальнай музыкі, аспірант*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*

***І. В. Хамутова,***
*выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору, аспірант*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# МАСТАЦКІЯ І КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА ФІЛЬМА ГАЛІНЫ АДАМОВІЧ «СТРАЛА»

**Анатацыя**. У артыкуле праводзіцца аналіз дакументальнага фільма Г. Адамовіч «Страла». Адзначаецца, што яго назва паходзіць ад унікальнага абраду «Пахаванне стралы», які захаваўся ў натуральным выглядзе ў аграгарадках Стаўбун і Малыя Нямкі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Заўважаецца, што фільм адлюстроўвае не толькі абрад, а таксама паказвае цяжкую жаночую долю. Кіналента тонка раскрывае псіхалагічны стан жанчын, якія прайшлі шмат жыццёвых выпрабаванняў, але засталіся шчырымі, адкрытымі і жыццярадаснымі, захоўваючы традыцыйнае светасузіранне. У артыкуле ажыццяўляецца аналіз мастацкіх сродкаў, з дапамогай якіх рэжысёр стварае вобраз фільма, раскрываюцца яго кампазіцыйныя асаблівасці.

**Ключавыя словы**: дакументальны фільм «Страла», «Пахаванне стралы», фальклорны гурт «Стаўбунскія вячоркі», Г. Адамовіч, светапогляд носьбітаў традыцыі, жаночая доля, свядомасць.

***A. Grishchenko,***
*Applicant for the degree of Candidate of Art History, Lecturer of the Department of Folk Instrumental music of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts";*

***I. Homutova,***
*Applicant for the degree of Candidate of Art History, Lecturer of the Department of Folksong Art and Folklore of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

**ARTISTIC AND CULTURAL FEATURES OF THE GALINA ADAMOVICH'S DOCUMENTARY FILM "THE ARROW"**

**Abstract**. The article analyzes the G. Adamovich's documentary film "The arrow". It is noted that it has its name from a unique ritual "The Burial of an Arrow" which is still preserved in its natural form particularly in agrotowns Staubun and Malyja Njamki of the Vetka District of the Gomel Region. The film has a very interesting composition. It is noticed that the film not only focuses on the reflection of the ritual but it is primarily about difficult woman's destiny. The film is very subtle to reveal the psychological state of women who have passed many life trials but despite this they remain very sincere, open and cheerful maintaining their traditional worldview. The article analyzes the artistic means with the help of which the director creates the image of the film as well as its compositional features.

**Keywords**: documentary film "The arrow", "The Burial of an Arrow", folklore group "Staubunskija vjachorki", G. Adamovich, worldview of holders of tradition, woman's destiny, consciousness.

Прэм'ерны паказ дакументальнага фільма «Страла» выдатнага беларускага рэжысёра Галіны Адамовіч адбыўся 7 кастрычніка 2021 г. у кінатэатры «Піянер» у Мінску. Фільм быў зняты ў аграгарадках Стаўбун і Малыя Нямкі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці студыяй дакументальнага кіно «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтарам сцэнарыя і рэжысёрам фільма з'яўляецца Г. Адамовіч, аператарам – Ю. Дакучаеў, гукарэжысёрам – З. Петрусенка, мантаж – В. Крына.

Назва кіналенты паходзіць ад назвы ўнікальнага абраду «Пахаванне стралы», які захаваўся ў аграгарадках і праводзіцца кожны год на саракавы дзень пасля Вялікадня, на Узнясенне Хрыстова. Сэнс гэтага абраду – захаваць будучы ўраджай ад летніх маланак. У фільме паказваецца абрад, як водзяць, а потым і хаваюць «стралу», што суправаджаецца спевамі адпаведных песень. Такім чынам, на першы погляд, можна зрабіць выснову, што кіналента адносіцца да жанру этналагічнага фільма, аднак гэта не адпавядае яе сутнасці.

У фільме галоўныя гераіні, удзельнікі фальклорнага гурту «Стаўбунскія вячоркі» – В. Марцян, Г. Чуяшова, У. Аніськова і кіраўнік гурту С. Парашчанка – расказваюць аб сваім жыццёвым, часта не вельмі шчаслівым лёсе, аб сям'і. Амаль кожную гісторыю гераінь можна параўнаць са стрэлам маланкі, які

сімвалізуе ўдар лёсу. Таму фільм прысвечаны цяжкай жаночай долі, тонка раскрывае псіхалагічны стан жанчын, якія прайшлі шмат жыццёвых выпрабаванняў, але засталіся шчырымі, адкрытымі і жыццярадаснымі. Гэта пацвярджае і сама Г. Адамовіч: «Я не этнограф, мне больш хацелася даведацца пра тое, хто гэтыя жанчыны, чаму яны гэта робяць, як жывуць? А яны насамрэч жывуць у традыцыі і акрэсленай сістэме каардынат: дакладна ведаюць, што такое добра, а што такое блага, што сорамна, а што не. Гэта і незвычайна, і выклікае павагу – яны быццам не з XXI стагоддзя» [2]. Падобную думку выказала і вядомы этнограф і сцэнарыст Р. Гамзовіч, на паказе яна заўважыла, што кіналента «Страла» – не проста этнаграфічны фільм, а сапраўдны псіхалагічны партрэт галоўных гераінь. Таму, можна сказаць, што мэта фільма – праўдзіва перадаць унікальны ўнутраны свет жанчын, іх асаблівы светапогляд, які вызначае іх жыццё, і які быў характэрны для нашых продкаў.

Уражвае, што галоўныя гераіні кіналенты адкрытыя і шчырыя з яе стваральнікамі. Яны расказваюць гісторыі са свайго жыцця, і гэта стварае тыя непаўторныя атмасферу і каларыт фільма, якія робяць яго яскравым і шчырым.

Адзначае М. Белаокая: «Беларуская глыбінка, будзённыя сцэны з жыцця вясковых жыхароў – у цэнтры кінаапавядання ў карцінах Г. Адамовіч» [4]. У «Страле» шмат эпізодаў, дзе паказваецца цяжкая вясковая праца, якая суправаджаецца каментарамі вяскоўцаў. Адна гераіня з вёскі гаворыць, што з'язджаць у горад не будзе і ніколі не хацела, бо тут яе карані, тут прайшло усё жыццё, тут і паміраць». Гэта сведчыць, што, нягледзячы на цяжкае жыццё ў вёсцы, жанчыны любяць свае родныя мясціны і не могуць іх пакінуць, абмяняць на жыццё ў горадзе.

Рэжысёр часта выкарыстоўвае крупны план для паказу рэалістычных партрэтаў гераінь, каб глядач мог разгледзець псіхалагічны стан жанчын. Бліжні ракурс здымкі дае магчымасць убачыць іх сапраўдны ўнутраны свет, што яны перажылі ў сваім жыцці. А перажылі яны, сапраўды, шмат. Напрыклад, тры гераіні пахавалі сваіх мужоў. Менавіта таму ў пачатку здымак Г. Адамовіч дала назву фільму «Удовы». Але такая назва паверхнасная і не адлюстроўвае сэнс фільма, які значна глыбей.

У кіналенце аператарам паказваецца вялікая колькасць агульных планаў вёсак, зробленых з вышыні птушынага палёту (з дапамогай дрону), як падчас правядзення абраду, так і пры размове з жанчынамі, а таксама шмат агульных планаў беларускай прыроды, што дапамагае ўбачыць прыгажосць краявідаў, асаблівы характар, настрой, яднанне плыней удзельнікаў абраду «стрэльнымі» песнямі – стварэнне рытуальнага адзінства і адчуванне калектыўнай фальклорнай свядомасці, прасякнутай міфалагемай «стралы».

Акрамя агульных планаў вёскі аператар часта паказвае эпізоды, знятыя каля вясковай хаты: ці то аповед жанчыны, ці то нейкае дзеянне, ці від хаты. Усё дапамагае стварыць атмасферу адзінства чалавека, яго жыццёвай прасторы і прыроды. Архітэктурная спадчына вёскі паказана ў натуральным выглядзе, у якім яна існуе ў рэчаіснасці. Таксама значная частка фільма праходзіць у памяшканні, у хатах жанчын. Пры гэтым усё паказана максімальна праўдападобна і шчыра. Аператарам выкарыстоўваюцца «“падглядваючыя” ракурсы, імітуючыя погляд старонняга назіральніка (з-за вугла, праз кусты і г. д.), і прыём “забытай камеры”» [3], дзякуючы гэтаму ствараецца адчуванне прысутнасці гледача ў месцы, дзе адбываецца дзеянне фільма.

Гукавое суправаджэнне кінакарціны адыгрывае вялікую ролю ў стварэнні вобразаў. Увогуле, «усе гукавыя кампаненты – маўленчы, музыкальны і шумавы – іграюць значную ролю ў дакументальных фільмах Г. Адамовіч» [1, с. 192]. У фільме галоўнае месца займае маўленчы кампанент – шматлікія размовы і інтэрв’ю розных герояў. Таксама значную ролю адыгрывае музычны кампанент – народныя песні, прыпеўкі і танцы. У фільме прагучалі народныя песні «Ты ідзі, страла, да ўздоўж сяла», «Сіне морачка глыбока», «Калінка-малінка», «Вербачка вярбовая» і «Палюбіла казака». Шумавы кампанент гукавой партытуры фільма займае не такое вялікае месца, як два іншыя, але дапамагае стварыць і падтрымаць настрой падзей. Напрыклад, калі размова ідзе пра розныя жыццёвыя выпрабаванні жанчын, у кадры бачны лес падчас дажджу, што суправаджаецца гукамі грому і маланкі.

Фільм мае цікавую кампазіцыйную пабудову. Паказаны фрагменты самога абраду «Пахаванне стралы», альбо выканан-

не носьбітамі традыцыі «стрэльных» песень «для сябе» ў неўласцівых умовах, напрыклад, пасля працы каля хаты, што дапамагае гледачам адчуць і ўбачыць, што карэннае мясцовае насельніцтва вёскі жыве ў сваёй традыцыі і беражліва яе захоўвае. Паміж гэтымі часткамі асноўнае месца займаюць размовы з жанчынамі ў розных абставінах і месцах, якія часта перарываюцца эпізодамі з выступленнямі калектыву, інтэрв’ю некалькіх чалавек і расказваюць пра сутнасць абраду «Пахаванне стралы» і калектыў «Стаўбунскія вячоркі», фрагменты свят і г. д. Такое рэжысёрскае рашэнне дапамагае гледачу глыбока перажываць падзеі фільма, а таксама выклікае зацікаўленасць, што будзе далей з героямі.

Фільм «Страла» Г. Адамовіч адлюстроўвае самабытнае жыццё аграгарадкоў Стаўбун і Малыя Нямкі, адсылае да сацыяльных праблем мясцовых жыхароў, раскрывае светапогляд носьбітаў традыцыі і іх светасузіранне. Аналіз мастацкіх асаблівасцей і кампазіцыйнай пабудовы кіналенты дазваляе сцвярджаць, што ёй уласцівыя ўсе характэрныя для творчасці Г. Адамовіч рысы. Фільм, безумоўна, будзе адыгрываць значную дакументальную ролю, таму што ён адлюстроўвае ўнікальны абрад «Пахаванне стралы» і захавае яго для нашчадкаў.

---


*1. Карасева, Н. А.* Художественные особенности звука в документальном кинематографе Г. Адамович / Н. А. Карасева // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, дзярж. навук. установа «Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы». – Мінск, 2012. – Вып. 12. – С. 191–196.

*2. Кудрэйка, Н.* «Пахаваць стралу», каб жыла вёска [Электронны рэсурс] / Н. Кудрэйка // рэдакц.-выдавец. установа «Культура і мастацтва». – Рэжым доступу: http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=18470. – Дата доступу: 23.03.2022.

*3. Харитоненко, А. В.* Авторский стиль в белорусском неигровом кино 1990–2010-х годов / А. В. Харитоненко // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, дзярж. навук. установа «Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы». – Мінск, 2014. – Вып. 17. – С. 127–133.

*4.* Экран и культурное наследие Беларуси / А. А. Карпилова [и др.] ; редкол.: А. И. Локотко, А. В. Красинский, А. А. Карпилова ; Нац. акад. наук Беларуси, гос. науч. учр-е «Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы». – Минск, 2011. – С. 314.